1. Прыем асабістай значнасці ці суаднесенасць з сабою.

(Гэты прыем ляжыць у аснове творчага працэсу. Адшукаць у сваей эмацыянальнай памяці аналагічныя моманты. Усе суаднесці з сабой, зрабіць сваім асабістым, значным для сябе.)

2. Прыем фіксацыі бачанняў у прасторы і руху.

3. Прыем канкрэтызацыі.

(Прадмет успрымаецца ўсім комплексам адчуванняў, але штосьці дамініруе ў гэтых адчуваннях. Выбраць моцныя адчуванні, якія ўразілі выканаўцу.)

4. Прыем перабольшвання і пераменшвання. (Каб бачанні хвалявалі выканаўцу, яны павінны быць не радавымі, звычайнымі. Яны павінны быць вышэй звычайнага ўзроўню, звычайнай нормы: яны занадта прыгожыя альбо брыдкія; гарачыя ці халодныя. Гэта згустак найбольш яркага і характэрнага.)

У мэтах замацавання гэтых прыёмаў прапануецца студэнтам зрабіць невялікія слоўныя эцюды на знаёмыя тэмы: «Мая сям'я», «Мой любімы занятак», «Цікавая сустрэча», «Маё дзяцінства» і інш.

У выпрацоўцы вобразных бачанняў шырока выкарыстоўваць другія віды мастацтва (жывапіс, музыку, кіно і інш.).

Вітошкіна З.М.,
ст.выкладчык

## БАЛЬ НА ПЛОШЧЫ, СТАДЫЕНЕ

На сучасным этапе актуальным з'яўляецца адраджэнне шляхецкага этыкету пры стварэнні танцавальных кампазіцый у тэатралізаваных баляваннях, карнавалах на плошчах, стадыёнах, у парках. Таму вельмі адказным павінен быць рэжысёрскі падыход да стварэння гэтых прадстаўленняў, адбор сродкаў пластыка-харэаграфічнага вырашэння танцавальных кампазіцый, якіх патрабуе кожная гістарычная эпоха.

Заключнай часткай пераважнай большасці свят з'яўляецца баль ці карнавал на плошчы. Чым аб'ёмней выкарыстоўваюцца разнастайныя віды танцавальнай лексікі, тым вышэй мастацкі ўзровень балю. Вялікае значэнне ў стварэнні кампазіцый на аснове гістарычна-бытавога танца мае падбор музычнага матэрыялу. Музыка вызначае не толькі рытмічны бок танца, яна падказвае характар выканання. Пажадана, каб студэнты авалодалі метадам стварэння ўласных кампазіцый на аснове гістарычна-бытавых танцаў. Знаемства з разнастайнымі танцавальнымі стылямі, сапраўднымі музычнымі крыніцамі ўзбагачае творчую палітру будучых рэжысёраў, вучыць узнаўляць карціны мінулых эпох.

На балі і маскарады было прынята з'яўляцца ў нязвыклах строях і масках. На баляваннях у феадалаў ствараліся праменадныя танцы - шэсці. Яны мелі ўрачысты характар і былі тэхнічна нескладанымі. Таму ў дадзеным фрагменце свята могуць удзельнічаць выканаўцы, не маючыя спецыяльнай харэаграфічнай падрыхтоўкі.

Госці, што былі ўдзельнікамі балю, у сваіх лепшых уборах праходзілі перад гаспадаром, быццам дэманструючы сябе і свой убор. Гэта і быў асноўны сэнс танца - шэсця. Шэсце можна зрабіць пры вызначэнні лепшага касцюма балю. Урачыстасць правядзення конкурсу спрыяе стварэнню святочнага настрою ўдзельнікаў і гледачоў прадстаўлення.

Вялікае значэнне мае перамяшчэнне ўдзельнікаў танцавальнай кампазіцыі на плошчы, лагічныя пераходы з аднаго малюнка ў другі. Для гэтага пажадана выкарыстоўваць геаметрычна правільныя фігуры: вертыкальныя і гарызантальныя лініі, кругі, ромбы, дыяганалі і г.д.

Пластыка-харэаграфічнаму вырашэнню прадстаўлення на плошчы належыць вядучае месца ў тэатралізаваным дзеянні. Граматная праца са сцэнарыем дапамагае вызначыць яркія бакі тэатралізаванага спектакля - прадстаўлення, здзейсніць цікавыя пастаноўкі танцавальных кампазіцый розных эпох, у тым ліку балю, і ажыццявіць іх на плошчы ў гонар вялікай падзеі, свята горада, рэспублікі і інш.

У час падрыхтоўкі свята неабходна вырашыць рад пытанняў. Галоўныя з іх наступныя.

1. У залежнасці ад прасторы і рэльефу, які выкарыстоўваецца для прадстаўлення, вядуцца падрыхтоўка графічнага плана перамяшчэння ўдзельнікаў кампазіцыі, падбор музычнага матэрыялу.

2. Падбор удзельнікаў выступлення, вывучэнне танцавальных кампазіцый; стварэнне ці падбор касцюмаў для балю.

3. Рэпетыцыі на месцы правядзення свята.

Асновай поспеху ў вырашэнні праблем, якія ўзнікаюць у ходзе падрыхтоўкі і правядзення свята, з'яўляюцца паэтапная папярэдняя праца рэжысёра, поўнае выкарыстанне яго арганізацыйных і творчых здольнасцей.

**Матульскі Р.С.,**
**дацэнт**

## ПЕРСПЕКТЫЎНЫЯ НАПРАМКІ РАЗВІЦЦЯ БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНАЙ АДУКАЦЫІ Ў КРАІНАХ ЕЎРОПЫ І БЕЛАРУСІ

**1. Месца і роля бібліятэк ў грамадстве.** Змест і асноўныя напрамкі развіцця бібліятэчна-інфармацыйнай адукацыі неразрыўна звязаны з сацыяльным прызначэннем бібліятэк

і іншых інфармацыйных устаноў, функцыямі, якія ўскладае на іх грамадства. Бібліятэкі Беларусі незалежна ад іх тыпу павінны пераарыентавацца, у першаю чаргу, на задавальненне інфармацыйных патрабаванняў грамадства.

**2. Патрабаванні да супрацоўнікаў бібліятэчна-інфармацыйных устаноў.** Зыходзячы з сацыяльнага прызначэння бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў, сусветным супольніцтвам вызначаны асноўныя патрабаванні да бібліятэчна-інфармацыйных супрацоўнікаў. Яны прадугледжваюць перш за ўсё наяўнасць ў спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі, моўнай, камп'ютэрнай і бібліятэчнай падрыхтоўкі.

Калі ў галіне агульнанавуковай і бібліятэчнай падрыхтоўкі на факультэце БІС назапашаны пэўны станоўчы вопыт, які патрабуе ўдасканалення з пункту гледжання сусветных патрабаванняў, то моўная і камп'ютэрная падрыхтоўка знаходзяцца на этапе станаўлення.

Сучасны работнік бібліятэчна-інфармацыйнай сферы павінен валодаць 2-3 замежнымі мовамі, ў т.л. англьскай. Інакш сфера яго дзейнасці звужаецца да працы толькі з нацыянальнымі дакументамі, а гэта вядзе да фактычна інфармацыйнай самаізаляцыі грамадства.

Асаблівую ўвагу сусветнае супольніцтва ўдзяляе набыццю глыбокіх ведаў па замежных мовах ў прафесарска-выкладчыцкага складу бібліятэчных школ. У сучаснай сітуацыі немагчыма разлічваць на высокі ўзровень выкладання, а адпаведна і на падрыхтоўку канкурэнтназдольных спецыялістаў толькі на базе нацыянальных крыніц.

Валоданне супрацоўнікамі бібліятэчна-інфармацыйных цэнтраў сучаснымі камп'ютэрнымі тэхналогіямі прадугледжвае не проста веданне асноў камп'ютэрнай тэхнікі, але і ўменні працаваць з сучаснымі відамі электронных дакументаў, ствараць адпаведныя біблія-графічныя і тэкставыя базы дадзеных, кіраваць імі, умець працаваць з аддаленымі базамі дадзеных, ў т.л. замежнымі.

**3. Рынак працы.** Выпускнікі нашага факультэта зараз карыстаюцца попытам і без праблем працаўладкоўваюцца ў бібліятэках рэспублікі,інфармацыйных і камерцыйных цэнтрах. Гэта сведчыць аб неабходнасці пашырэння пераліку спецыяльнасцей і спецыялізацый па падрыхтоўцы не толькі бібліятэчных спецыялістаў, але і кадраў для іншых сфер дзейнасці.

**4. Фінансаванне адукацыі.** Традыцыйна падрыхтоўка кадраў ажыццяўлялася за кошт дзяржаўнага бюджэту. Але ва ўмовах рынкавай эканомікі неабходна пераходзіць і на іншыя крыніцы, у першую чаргу сродкі прадпрыемстваў і ўстаноў, сродкі асобных грамадзян, а таксама выкарыстоўваць фінансавыя магчымасці замежных фондаў і праграм.

Іваноў М.В.,
дацэнт
Ровіна Р.А.,
дацэнт

## УКАРАНЕННЕ НОВЫХ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ У БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ КУРСЫ

1. У бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэк і органаў інфармацыі ў залежнасці ад інфармацыйнага і тэхнічнага ўзроўню сёння выкарыстоўваюцца і традыцыйныя, і аўтаматызаваныя тэхналогіі. Чым вышэй узровень інфармацыйнай індустрыі, тым менш традыцыйных тэхналогій ў бібліяграфічнай дзейнасці. Адным з распаўсюджаных прадуктаў сучасных інфармацыйных тэхналогій з'яўляюцца бібліяграфічныя рэфератыўныя базы дадзеных (БД), якія выкарыстоўваюцца альбо лакальна, альбо ў рэжыме тэледоступу.

У развітых краінах базы дадзеных як асноўны прадукт інфармацыйнага рынку пры наяўнасці ў карыстальнікаў персанальных ЭВМ эканомяць час і сродкі навукоўцаў і спецыялістаў. Напрыклад, выкарыстанне БД па энергетыцы прынесла амерыканскай навуцы эканомію ў 3 млрд. долараў, БД па вышэйшай адукацыі - 600 долараў на кожнага дыпламаванага спецыяліста.

Вышэйазначанае і першапачатковы этап укаранення БД у бібліятэках Беларусі ўказваюць на неабходнасць камп'ютэрнай падрыхтоўкі студэнтаў універсітэта.

2. Паслядоўнасць вывучэння дысцыплін, у якіх разглядаюцца аўтаматызаваныя тэхналогіі, вызначаецца вучэбным планам. Да вывучэння галіновых бібліяграфічных курсаў студэнты ўсіх спецыялізацый ФБІС вывучаюць шэраг дысцыплін, у якіх у той ці іншай ступені асвятляюцца пытанні камп'ютэрызацыі бібліятэчна-бібліяграфічных працэсаў, у прыватнасці: «Вылічальная тэхніка», «Аналітыка-сінтэтычная апрацоўка дакументаў», «Бібліятэказнаўства», «Бібліяграфазнаўства», «Арганізацыя і методыка бібліяграфічнай работы». Акрамя таго, студэнты спецыялізацый «бібліятэказнаўства і бібліяграфія тэхнічнай літаратуры» і «аўтаматызаваныя бібліятэчна-інфармацыйныя сістэмы» атрымліваюць дадатковую інфармацыю яшчэ ў курсе «Патэнтная і нарматыўна-тэхнічная дакументацыя».

3. Курс «Бібліяграфія прыродазнаўчай, тэхнічнай і сельскагаспадарчай літаратуры» дае студэнтам дадатковую магчымасць авалодаць тэарэтычнымі ведамі і практычнымі навыкамі ў галіне нетрадыцыйнай бібліяграфічнай тэхналогіі і абслугоўвання спецыялістаў.

Тэарэтычныя веды студэнты атрымліваюць пры выкладанні тэм, прысвечаных падрыхтоўцы розных відаў дапаможнікаў у аўтаматызаваным рэжыме (рэфератыўныя часопісы, зводныя каталогі замежных дакументаў, справаздачы аб